нараджаюць асацыяцыі ў гледача, дапамагаюць паэтапнаму асэнсаванню дзеяння і стварэнню на яго аснове мастацкага выразу свята.

Такім чынам, прафесійныя кампетэнцыі рэжысёра ўключаюць не толькі рэалізацыю задумы свята, але і ўздзеянне на гледача, на яго ўнутраны свет. Таму быць выдатным рэжысёрам азначае ведаць актуальныя праблемы сучаснасці, валодаць уменнем мысліць незвычайна, улічваць псіхалогію людзей living рознага ўзросту, іх этнічныя асаблівасці, ствараць у рэжысуры падтэкст у развіцці сюжэта, магчымасць дадумаць яго ў сувязі з пачутым і ўбачаным на сцэне. Вырашыць гэтыя задачы магчыма пры ўмове стварэння мастацкага вобраза, які скіраваны на развіццё мыслення гледача, надае святу прывабнасць і загадкавасць.

УДК [316.722+7.046.1](476)(48)

***Ю. С. Барадзін,***
*аспірант кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,*
*г. Мінск, Беларусь*

## БЕЛАРУСКАЯ І СКАНДЫНАЎСКАЯ МІФАЛОГІЯ Ў МІЖКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

**Анатацыя.** Міжкультурная камунікацыя паміж Рэспублікай Беларусь і прадстаўнікамі скандынаўскіх краін неабходна як сродак узаемасувязі і зносін паміж людзьмі, якія прадстаўляюць свае культуры. Беларусы і скандынаўскія народы могуць паміж сабой абменьвацца ўласнымі міфалогіямі, пантэонам багоў, каб перадаваць інфармацыю ад адной язычніцкай культуры да другой, і ствараць такім чынам параўнальную міфалогію.

**Ключавыя словы:** міфалогія, язычніцтва, міжкультурныя сувязі, камунікацыі, масавая культура, сучаснасць, пантэон, багі.

***Y. Baradzin,***
*Postgraduate student of the Department of Cultural Studies of the*
*Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts",*
*Minsk, Belarus*

**BELARUSIAN AND SCANDINAVIAN MYTHOLOGY IN INTERCULTURAL COMMUNICATION**

**Abstract.** Intercultural communication between the Republic of Belarus and representatives of the Scandinavian countries is necessary as a means for interrelationships and communication between people representing their cultures. Belarusians and Scandinavian peoples can exchange their own mythologies, a pantheon of gods, in order to transfer information from one pagan culture to another, and thus create a comparative mythology.

**Keywords:** mythology, paganism, intercultural relations, communications, mass culture, modernity, pantheon, gods.

Сучасная культура Беларусі і Скандынавіі будуецца на культурнай спадчыне язычніцкага мінулага. Міжкультурныя камунікацыі паміж беларусамі і скандынавамі адлюстроўваюць побыты, норавы і традыцыі старажытных продкаў, якія захаваліся ў язычніцкіх абрадах і рытуалах беларускага і скандынаўскага фальклору, у масавай і медыякультуры канца XX – пачатку XXI ст., навуковай мастацкай літаратуры Беларусі і Скандынавіі. Пошук і знаходжанне падабенства функцый, якія выконваюць беларускія і скандынаўскія багі, параўнальныя аналізы беларускай і скандынаўскай міфалогій шматбожжа дають новыя падставы, умовы, нагоды і магчымасці для міжкультурных камунікацый паміж Рэспублікай Беларусь і краінамі Скандынавіі (Нарвегія, Швецыя, Данія, Ісландыя).

Сучасныя скандынавы, як і беларусы, адраджаюць язычніцкі пантэон багоў [1], што паспрыяе ў будучыні стварэнню параўнальнай міфалогіі, якая дазволіць знайсці агульныя рысы падабенства беларускага [2] і скандынаўскага [3] пантэона багоў: (Пярун – бог-заступнік ваяроў, як бог вікінгаў – Одзін, і грамабой з маланкамі і навальніцай выконвае функцыі скандынаўскага Тора; Бялун-Белбог – бог неба з функцыямі Одзіна; Чарнабог – бог зла з рысамі бога падману – Локі; Сварог – бог агню, як Локі, і бог-каваль, як скандынаўскі Вёлунд; Ярыла кіруе вясной, як Бальдр; Зюзя кіруе зімой, снегам і маразамі падобна сляпому Хёду, Улю і багіні Скадзі; Дажбог – бог сонца, як і скандынаўскі Фрэйр; Лада – багіня любові з функцыямі скандынаўскай Фрэі; Лёля – багіня вясны з функцыямі Бальдра; багіня Мокаш кіруе лёсам, як тры скандынаўскія багіні лёсу – Урд, Вердандзі, Скульд; Жыцень выконвае функцыі Фрэйра, як

бог восені, а Купала, як бог лета, таксама падобны Фрэйру; Стрыбог кіруе ветрам, як з скандынаўскіх багоў-ванаў – Ньёрд; Род – першабог і першапродак багоў падобна скандынаўскаму Буры – бацьку аса Бёра і дзеда Одзіна) [5, с. 29].

У беларусаў і скандынаваў ёсць падобныя духі: нісэ – скандынаўскі варыянт беларускага дамавога, хатніка, ундзіны – скандынаўскія русалкі, у беларусаў завуцца проста русалкамі, зелігены і фенке – ахоўнікі скандынаўскіх лясоў (як Лясун ахоўвае беларускія лясы), ніксы – духі вады, скандынаўскае ўвасабленне беларускага Вадзяніка [6, с. 248].

У беларускім і скандынаўскім фальклоры сустракаюцца падобныя язычніцкія абрады: сейд – скандынаўскі рытуал для здзяйснення магічнай практыкі, які мае падабенства з беларускімі абрадамі – біццё посуду, выклiканне дажджу, карагод для спрыяння добраму ўраджаю, абворванне, выраб абыдзённіка, пераварочванне, калыханне на арэлях і праміванне для абароны ад нячыстай сілы, эпідэміі, для падману хвароб, лячэння хворых дзетак праз купальскі вянок і пераходу ў іншы духоўны стан [4, с. 323]; лекавыя замовы – беларускі варыянт вяртання хвораму здароўя, як скандынавы – з дапамогай рунаў; ландветар – скандынаўскі варыянт беларускага абраду пакланення духам, святым камяням і дрэвам; хольмганг – напамінае архетыпічнае змаганне паміж грамабоем Перунам і змеем-цмокам [4, с. 333].

У канцы XX – пачатку XXI ст. праз рок-музыку і субкультуру металістаў ідзе працяг міжкультурных камунікацый. Беларусь і краіны Скандынавіі – не выключэнне. Як у скандынаўскіх краінах, так і ва ўсіх краінах свету, а таксама ў Беларусі распаўсюджаны viking metal [12]. Паколькі англійская мова з’яўляецца мовай міжнародных зносін, беларускія вікінг-метал гурты, выконваючы некаторыя творы па-англійску, праз англійскую мову з’яўляюцца таксама гуртамі, вядомымі на ўвесь свет, і праз яе падтрымліваюць міжкультурныя стасункі з іншымі замежнымі гуртамі сучасных вікінгаў.

Міжнародныя сувязі паміж беларусамі, скандынавамі і іншымі народамі працягваюцца праз nordic-viking-folk – музыку вікінгаў ранняга Сярэдневякоўя, якую цалкам рэканструююць праз народныя інструменты – бубны, барабаны з конскай скурай і скурай казы і рог [11].

«Вялікае княства Сула» – парк-музей інтэрактыўнай гісторыі, які знаходзіцца ў 49 км ад Мінска, займаецца працягам культуралагічнай рэканструцыі скандынаўскай спадчыны, што ўзмацняе гісторыка-культурныя сувязі паміж беларусамі і скандынавамі. На тэрыторыі Сулы, дзе праходзяць экскурсіі для наведвальнікаў, захоўваюцца разнастайныя рэчы вікінгаў ад іх зброі да дракараў (караблёў), на якіх яны раней здзяйснялі набегі.

Праводзяцца ў Беларусі рыцарскія турніры з удзелам апранутых у касцюмы вікінгаў людзей для рэканструявання ранняй гісторыі. Працягваюцца археалагічныя раскопкі на тэрыторыі былога Полацкага княства і іншых месцаў, дзе вікінгі пакінулі гістарычны след.

Беларускі даследчык міфалогіі – Аляксей Ненадавец праводзіць параўнальны аналіз беларускай і скандынаўскай касмагоніі (стварэнне космасу-свету з хаосу і пустэчы) і падкрэслівае ролю багоў у існаванні свету [6, с. 25]. Вячаслаў Калацэй у вучэбным дапаможніку «Параўнальная міфалогія» адлюстроўвае падабенства функцый беларускіх, скандынаўскіх і іншых індаеўрапейскіх багоў [5, с. 30]. Яўген Папакуль пераклаў «Старэйшую Эду» Сэмунда Мудрага [9, с. 269] і «Малодшую Эду» Сноры Стурлусана [10, с. 58] са старажытнаісландскай на беларускую мову. Такім чынам, скандынаўскія багі праз яго пераклады ўпершыню пачалі размаўляць па-беларуску.

У артыкуле «Скандынаўская культурная прысутнасць у сярэдневяковым Полацку» С. А. Шыдлоўскі згадвае пра культурнае ўзаемадзеянне скандынаўскай і полацкай культур [8, с. 85]. Шыдлоўскі таксама спасылаецца на пісьмовыя крыніцы Полацка, указваючы пры гэтым на скандынаўскае паходжанне Рагвалода і на вялікую ролю скандынаўскай культуры ў гісторыі старажытнай Беларусі. Шыдлоўскі лічыць, што ў нарвежскай гісторыі захоўваецца нарвежская сага пра Рагвалода (Ragnvaldr) і Рагнеду (Ragnheidr) [8, с. 86].

У выданні да адкрыцця выставы «Вікінгі на Усходзе» пад аўтарствам С. Д. Дзярновіча – сумеснага праекта Дзяржаўнага гістарычнага музея Швецыі, Шведскага інстытута, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі – каталог уключае археалагічныя знаходкі, якія пацвярджаюць сувязі паміж скандынаўскай і полацкай культурамі [7, с. 3].

Рэканструкцыя язычніцкай міфалогіі, беларускага і скандынаўскага пантэона дэміургаў узмацняе міжкультурныя камунікацыі. Вывучэнне язычніцкіх міфаў у культуралагічным аспекце дазваляе рэканструяваць язычніцкую спадчыну Беларусі і Скандынавіі для культурных узаемасувязей.


*1.* Багі Скандынавіі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.delachieve.com/%D0%B1%D0%B0%D0%B3%D1%96-%D1%81%D0%BA%D0%B0%D0%BD%D0%B4%D1%8B%D0%BD%D0%B0%D0%B2%D1%96%D1%96-%D1%85%D0%B5%D0%B9%D0%BC%D0%B4%D0%B0%D0%BB%D0%BB%D1%8C-%D1%85%D0%B5%D1%80%D0%BC%D0%BE%D0%B4/. Дата доступу: 17.10.2024.

*2.* Багі старажытных беларусаў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://project4948754.tilda.ws/page24194379.html. – Дата доступу: 17.10.2024.

*3.* Боги и богини скандинавской мифологии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.laconlife.ru/scandinavian-gods/. – Дата доступа: 17.10.2024.

*4. Дучыц, Л.* Язычніцтва старажытных беларусаў / Людміла Дучыц, Ірына Клімковіч. – Мінск : Харвест, 2014. – 368 с.

*5. Калацэй, В. В.* Параўнальная міфалогія / Вячаслаў Калацэй. – Мінск : Зорны верасень : Паркус плюс, 2009. – 116 с.

*6.* Міфалогія. Духоўныя вершы / А. М. Ненадавец [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 471 с.

*7. Сідаровіч, В. М.* «Вікінгі на Усходзе» – канцэпцыя шведска-беларускай выставы / В. М. Сідаровіч, М. А. Плавінскі. – Мінск, 2003. – 85 с.

*8. Шыдлоўскі, С. А.* Скандынаўская культурная прысутнасць у сярэдневяковым Полацку / С. А. Шыдлоўскі // Труды молодых специалистов Полоцкого гос. ун-та. – Новополоцк, 2007. – С. 85–86.

*9.* Эда. Песні пра багоў / уклад., пер. са старажытнаісл. Яўгена Папакуля. – Мінск : Галіяфы, 2021. – 321 с.

*10.* Эда Сноры Стурлусана / уклад., пер. са старажытнаісл. Яўгена Папакуля. – Мінск : Галіяфы, 2021. – 298 с.

*11.* Nordic folk music [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.last.fm/tag/nordic+folk/artists. – Data of access: 06.12.2023.

*12.* Viking metal music [Electronic resource]. – Mode of access: Top viking metal artists | Last.fm. – Data of access: 06.12.2023.